# ВЕЦЕР У ТВАР

НІКАЛАЕЎ ІВАН СТАФАНАВІЧ

*Нарадзіўся ў 1916 годзе ў горадзе Клімавічы. Закончыў Клімавіцкую сямігодку. Васемнаццацігадовым добраахвотна пайшоў у Чырвоную Армію. Пасля службы паступае ў ваеннае авіяцыйнае вучылішча і становіцца лётчыкам-штурмавіком.*

*За баявыя подзвігі на франтах Вялікай Айчыннай вайны ўзнагароджан двумя ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Багдана Хмельніцкага III ступені, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I ступені і медалямі.*

*Званне Героя Савецкага Саюза маёру I .С. Нікалаеву прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 мая 1946 года (пасмяротна).*

У жыцці сустракаецца нямала надзвычай упартых людзей. Упартых у самым лепшым сэнсе гэтага слова. Вызначыўшы сваю жыццёвую мэту, яны ідуць уперад. Ідуць, нягледзячы на сустрэчны вецер. Спатыкаюцца, церпяць няўдачы, але працягваюць ісці і дабіваюцца перамогі.

Да такіх "упартых" можна з поўнай падставай аднесці Івана Стафанавіча Нікалаева. Была ў яго запаветная мара – стаць лётчыкам. Паспрабаваў тайна ад сяброў і родных паступіць у лётнае вучылішча. Атрымаў адмову: не мае папярэдняй падрыхтоўкі. А дзе яе атрымаць? Аэраклуба ў Клімавічах няма. Нават самалёты ён бачыў у тыя рэдкія выпадкі, калі яны пралятал над горадам. Кіно, кнігі, газеты, часопісы... Вось, уласна, уся тая аснова, на базе якой развілося гарачае захапленне маладога чалавека. А ці ж у сваім захапленні Іван быў адзінокі? У тыя гады тысячы такіх жа летуценнікаў не ўяўлялі свайго жыцця без авіяцыі. А як туды трапіць?

Нікалаеў вырашыў ісці служыць у армію. Бліжэй да сваёй мары. Пайшоў. Служыў. Але да авіяцыі не стаў бліжэй, калі не лічыць таго, што для яго стала больш даступнай патрэбная літаратура. За два гады Іван перачытаў столькі кніг, падручнікаў і інструкцый, колькі ніколі б не спатрэбілася вучлёту. У думках ён мог разабраць і сабраць любы самалёт, лётаць на ім, выконваць самыя складаныя фігуры вышэйшага пілатажу. І гэта адчыніла Нікалаеву дзверы ў ваенна-авіяцыйнае вучылішча.

...Ва ўпартай вучобе ішлі дні, тыдні, месяцы. Зроблены першыя крокі па шляху да баявых самалётаў: асвоены мілыя сэрцу "Ў-2" і "Р-5", атрыман высокі разрад па парашутнаму спорту. Цяпер... Цяпер спецыялізацыя. Што выбраць? Бамбардзіроўшчык, штурмавік, знішчальнік? Задача не з лёгкіх, калі ўсе яны спадабаюцца. І ўсё-такі Іван часцей і часцей паглядваў на штурмавік. На палях і ў небе краіны

ўжо грукатала кананада, раўлі маторы, захліпаліся доўгімі чэргамі кулямёты і аўтаматы, лілася кроў і гінулі людзі. Лейтэнант Нікалаеў спяшаўся на фронт біць ненавіснага ворага...

Лістапад 1942 года. У саставе 4-й гвардзейскай авіяштурмавой дывізіі Нікалаеў штурмуе абарончыя збудаванні гітлераўцаў пад Калінінам, робіць разведвальныя палёты. З кожным днём расце яго майстэрства, павялічваецца колькасць баявых вылетаў, знішчанай фашысцкай тэхнікі и жывой сілы. На Варонежскім фронце ён становіцца вядучым звяна. У летніх баях на Курскай дузе водзіць на штурмоўку фашысцкіх танкавых калон чырваназорную эскадрыллю.

Эскадрылля Нікалаева была адной з лепшых у дывізіі. Цвярозы разлік, беззапаветная храбрасць камандзіра, умелае выкарыстанне ім баявых і тэхнічных якасцей "Ілаў" забяспечвалі нязменны поспех у выкананні баявых заданняў у цяжкіх і складаных баях Белгарадска-Харкаўскай і Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, у баях за вызваленне Кіева.

...На станцыі Сакалоўка, што паблізу граніцы з Румыніяй, паветранай разведкай выяўлена вялікае скапленне тэхнікі і людскіх рэзерваў праціўніка. Спрыяльная магчымасць для штурмавога ўдару! Але населены пункт прыкрываецца з паветра шматлікімі знішчальнікамі, а з зямлі забяспечан магутнай сцяной загараджальнага зенітнага агню.

– Заманлівая штука... – у роздуме прагаварыў камандзір палка. – На ражон палезеш – пагубіш людзей і машыны. Так, маёр?

– Само сабой... Падумаць трэба.

– Часу на доўгія роздумы няма. Фрыцы не будуць нас чакаць. Распаўзуцца.

– Зробім так... – узбуджана загаварыў Нікалаеў...

Над аэрадромам звінелі маторамі дзевяць знішчальнікаў суправаджэння. Адзін за адным у паветра ўзняліся дванаццаць штурмавікоў. Выстройваючыся, яны зрабілі разварот. Вядучы "Іл-2", за штурвалам якога сядзеў маёр Нікалаеў, злёгку пакачаў крыламі: сігнал для ўсіх – уперад!

Да Сакалоўкі "Ілы" падыходзілі на значнай вышыні. Яшчэ вышэй ляцелі "Які". Уперадзе шчыльна ўзрываліся бутоны беласнежнай ваты. Паветра прачэрчвалі шматлікія трасы снарадаў і куль. Разлік на тое, што нямецкія знішчальнікі рвануцца насустрач штурмавікам і тым самым прымусяць сваіх зенітчыкаў на час спыніць загараджальны агонь, не апраўдаўся. "Месеры" і "фоксвульфы" з зоны не выходзілі. Ну, што ж, паглядзім, хто каго перахітрыць.

– Я – Сокал. Другі варыянт. – Пачулі ўсе лётчыкі пазыўныя і загад камандзіра змешанай групы штурмавікоў і знішчальнікаў.

Кожны лётчык ужо ведаў, што яму рабіць. Штурмавікі паімкнуліся ўніз, на зенітныя батарэі. Сілу псіхалагічнага ўздзеяння гэтага манеўра Нікалаеў не раз ужо выпрабоўваў на гітлераўцах. Пырскнуўшы агнём "чорная смерць", як тыя называлі савецкія штурмавікі, пазбавіла

роздуму, паралізавала іх дзеянні. Выкарыстаўшы замяшанне супрацьпаветранай абароны, "Які" ўцягваюць у бой нямецкія знішчальнікі, прадастаўляючы магчымасць свабоднай "работы" для штурмавікоў.

Як задумана, так і зроблена. "Ілы" папрацавалі на славу. Некалькі дзесяткаў танкаў, аўтамашын і артылерыйскіх гармат, сотні салдат і афіцэраў, трох "мессершмітаў" не далічылася гітлераўскае камандаванне пасля палёту крылатых гвардзейцаў. Усе "Ілы" і "Як" вярнуліся на свае аэрадромы. Контрудар немцаў па наступаючых савецкіх войсках сарваўся.

...Маёр Нікалаеў, як і мільёны савецкіх салдат, якія змагаліся з гітлераўцамі, марыў убачыць тую зямлю, адкуль прыйшло так многа бед і пакут, гарэў жаданнем абавязкова даляцець да яе. Ззаду засталіся Румынія і Венгрыя...

Цудоўны вясновы дзень. Яркае сонца вісела над сіняй палоскай далёкага лесу. Яно нетаропка ўзнімалася вышэй. На празрыстым небе высока-высока свяціліся перыстыя воблакі, падобныя на лісце папаратнікў. А свежы ветрык гаспадарыў на аэрадроме. Іван Стафанавіч павярнуў свой разгарачаны твар да ветру...

Праз дзве гадзіны група штурмавікоў, якую вёў Нікалаеў, выйшла на цэль ля гарадка Ланжгот. Вогненным віхрам праімчалі яны над калонай фашысцкіх войск. На шасэ гарэлі танкі, аўтамашыны. Усё там змяшалася, пераблыталася. Яшчэ адзін заход. Яшчэ... Маёр цвёрдай рукой пускае штурмавік у піке і па машыне раптам звонка зашчоўкалі бранябойныя кулі. У твар лётчыка ўдарыў пругкі струмень ветру. Але ён ужо не адчуваў холаду. Яго мёртвыя рукі ўжо не маглі вывесці штурмавік з імклівага падзення.

**Вецер у твар // Магілёўская праўда. — 1970. — 12 жніўня. — С. 4.**